*В.П.ПРАКАПЦОВА*

# МАСТАЦКАЯ АДУКАЦЫЯ ЯК САЦЫЯКУЛЬТУРНЫ ПРАЦЭС

Фарміраванне сістэмы мастацкай адукацыі – працяглы гісторыка-культурны працэс, які адлюстроўвае ўзаемадзеянне, спалучэнне або дыферэнцыяцыю асобных элементаў адзінага, цэласнага арганізма, які называецца духоўнай, мастацкай культурай народа. Сацыяльныя патрэбнасці, што абумовілі зараджэнне вытокаў мастацкай адукацыі, часавае і прасторавае яе развіццё, сталі прынцыпова важнымі ў рэалізацыі адукацыйных метадаў. На працягу розных гістарычных эпох мастацкая адукацыя вызначалася пэўнымі функцыянальнымі задачамі, з’яўлялася неад’емнай часткай больш буйной сістэмы – мастацкай культуры народа.

Мастацкая культура і мастацкая адукацыя маюць як агульныя, так і спецыфічныя рысы. З аднаго боку, відавочна іх фармальная блізкасць (прыналежнасць да працэсу мастацкай творчасці, эмацыянальнасць успрымання свету, агульная дынаміка развіцця), з другога — значна адрозніваюцца іх сацыяльныя функцыі, дыялектыка станаўлення і развіцця.

Праблема паходжання і функцыянавання любой грамадскай з’явы, у тым ліку і мастацкай адукацыі, можа быць дакладна вырашана толькі пры ўліку канкрэтных сацыяльных умоў. Без вызначэння спецыфічных грамадскіх патрэбнасцей нельга зразумець сутнасць з’явы, яе сацыяльныя функцыі. У дачыненні да мастацкай адукацыі гэтае палажэнне прынцыпова важнае, бо мастацкая адукацыя заўсёды мае функцыянальную накіраванасць і сацыяльнае прызначэнне.

Фундамент сістэмы мастацкай адукацыі будаваўся на працягу стагоддзяў. Кожны віток развіцця мастацка-адукацыйнай сістэмы адпавядаў узроўню тагачаснай культуры, захоўваючы для будучыні лепшы мастацкі вопыт.

Мастацкая адукацыя заўсёды адлюстроўвала і факусіравала ў сабе сацыякультурныя прынцыпы і эстэтычныя кірункі пэўнай эпохі ў іх найбольш агульных (агульнаеўрапейскія тэндэнцыі), асаблівых (у межах Беларусі) і спецыфічных (у межах вызначанай мастацкай школы) праявах. Менавіта ўзаемаўплыў і ўзаемазалежнасць агульных, асаблівых і спецыфічных кампанентаў вызначаюць станаўленне сістэмы мастацкай адукацыі як сацыякультурнага працэсу і стымулююць яе развіццё.

Можна прасачыць адпаведнасць агульнаеўрапейскіх і нацыянальных (беларускіх) тэндэнцый развіцця мастацкай адукацыі, пэўную “паралельнасць” працякання працэсаў арганізацыі мастацкай адукацыі ў Беларусі і заходнееўрапейскіх краінах і вызначыць “адпаведныя” ці “запозненыя” стадыі станаўлення мастацкай адукацыі. Так, у эпоху сярэднявечча асноўнымі ачагамі прафесійнай музычнай адукацыі былі пеўчыя школы пры манастырах і саборах, што характэрна як для краін Заходняй Еўропы, так і для Полацкага і Тураўскага княстваў – асноўных дзяржаўных утварэнняў на тэрыторыі Беларусі таго часу. Разам з тым трэба адзначыць, што ў XII—XIV стст. у краінах Заходняй Еўропы ўжо пачалі адкрывацца універсітэты (Кембрыдж – 1129 г., Парыж – 1215 г., Прага – 1348 г., Кракаў – 1364 г., Вена – 1365 г. і інш.), у якіх вывучалася музычнае мастацтва ў межах “сямі вольных навук”. У адпаведнасці з прывілеем вялікага князя Казіміра, які быў выдадзены ў 1457 г., у некаторых з гэтых універсітэтаў (Прага, Кракаў і інш.) мелі магчымасць атрымаць адукацыю і ўраджэнцы беларускіх зямель.

Адпаведнасць, падобнасць асноўных сацыякультурных працэсаў і адначасовасць спецыфічных, адметных прымет у галіне мастацкай адукацыі ў Заходняй Еўропе і Вялікім княстве Літоўскім сведчаць як пра цэласнасць агульнакультурнага працэсу, так і пра дастаткова высокі ўзровень мастацкай культуры і мастацкай адукацыі на тэрыторыі Беларусі. У перыяд Адраджэння ў Заходняй Еўропе ўжо сфарміравалася сістэма адносна дакладнага і гібкага нотазапісу, было адкрыта нотадрукаванне, што паўплывала на развіццё розных музычных культур і сведчыць пра пэўную сінхроннасць працэсаў. Нават новы прынцып нотадрукавання, на які італьянец Атавіяна Петручы атрымаў прывілей Венецыянскага савета ў 1498 г., быў уведзены ва ўжытак у краінах Заходняй Еўропы і на тэрыторыі Беларусі з розніцай усяго ў некалькі дзесяцігоддзяў. Першае нотнае выданне

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

А.Петручы выйшла ў 1501 г., а ў Беларусі першыя нотадрукі з'явіліся ў 1558 г. ("Берасцейскі канцыянал") і ў 1563 г. ("Нясвіжскі канцыянал").

У перыяд Асветніцтва ў Беларусі таксама развіваліся адукацыйныя тэндэнцыі, якія ў той ці іншай ступені адпавядалі агульнаеўрапейскаму сацыякультурнаму працэсу.

Тэрыторыя сучаснай Беларусі, яе гарады ніколі да 20-х гадоў XX ст. не з'яўляліся цэнтральнымі. Беларусь была ўсходнім памежжам Заходняй Еўропы, а гарады сучаснай Беларусі – перыферыйнымі ў адносінах да дзяржаўных сталіц Вялікага княства Літоўскага, Рэчы Паспалітай, Расійскай імперыі. Таму на тэрыторыі сучаснай Беларусі на працягу стагоддзяў аб'ектыўна не маглі існаваць навучальныя ўстановы вышэйшага ўзроўню, якія адкрываліся толькі ў сталіцах заходнееўрапейскіх краін, хаця агульная тэндэнцыя фарміравання мастацкай адукацыі ў Беларусі адпавядала агульнаеўрапейскай.

Мастацкая адукацыя развівалася і існуе як частка, як адзін з аспектаў поліфункцыянальнай мастацкай культуры. Пачынаючы з XIX ст. мастацкая адукацыя набывае адносную самастойнасць і становіцца асобнай галіной культуры. Але яе дыферэнцыяцыя ва ўлонні мастацкай культуры не выходзіць за межы мастацкай культуры цалкам. Мастацкая адукацыя існуе адносна самастойна ў агульным сацыякультурным рэчышчы.

Магчымасць стварыць цэласную дзяржаўную сістэму адукацыі ў Беларусі з'явілася толькі ў XX ст. І, бадай, самым важным у гэтым працэсе было адкрыццё вышэйшых навучальных устаноў. У 20-я гады XX ст. былі ўтвораны Беларускі політэхнічны інстытут (1920) і Беларускі дзяржаўны універсітэт (1921). Канстатуючы фарміраванне цэласнай сістэмы дзяржаўнай мастацкай адукацыі ў сярэдзіне XX ст., што звязваецца з адкрыццём вышэйшых навучальных устаноў (Беларуская дзяржаўная кансерваторыя – 1932 г., з 1992 г. — Беларуская дзяржаўная акадэмія музыкі; Беларускі дзяржаўны тэатральна-мастацкі інстытут — 1945 г., з 1997 г. — Беларуская акадэмія мастацтваў; Мінскі інстытут культуры – 1975 г., зараз — Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры), мы разам з тым падкрэсліваем: сістэма мастацкай адукацыі працягвае развівацца і відазмяняцца. Новыя якасці і ўласцівасці мастацкай адукацыі фарміруюцца ў кірунку сінтэзу розных мастацтваў, і відаў творчай дзейнасці.

Для цэласнай сістэмы мастацкай адукацыі становяцца актуальнымі новыя прыметы і характарыстыкі, раней не ўласцівыя асобным яе элементам, формам і відам. Гэтыя структурныя рысы і прынцыповая навізна якасцей фарміруюцца ў выніку як ўзаемадзеяння (сінтэзу) у мастацкай практыцы саміх відаў мастацтва і мастацкай творчасці, так і ўдасканалення формаў і метадаў навучання на падставе сучаснага светаўспрымання. Фарміраваннем цэласнай дзяржаўнай сістэмы мастацкай адукацыі завяршыўся пэўны віток яе развіцця. Прызнанне сучаснай сфарміраванай сістэмы мастацкай адукацыі стала падставай для распрацоўкі новых прагнастычных адукацыйных канцэпцый.

Шматбаковае і сістэмнае асэнсаванне прыроды мастацкай адукацыі, яе сувязей з разнастайнымі і шматлікімі аспектамі сацыяльнага жыцця фарміруе ацэначныя крытэрыі і прынцыпы прагназіравання развіцця адукацыйнай сістэмы ў мастацкай культуры. Хаця мастацкая адукацыя ў галіне традыцыйных мастацтваў і базіруецца толькі на вывучэнні мастацкай культуры сродкамі самога мастацтва і метадах, якія дазваляюць авалодаць гэтымі мастацкімі сродкамі (шляхам спасціжэння музыкі, тэатра ці выяўленчага мастацтва), яна (мастацкая адукацыя) уваходзіць у шырокую сістэму сацыякультурных зносін і цэлага шэрага з'яў, звязаных з перадачай мастацкай інфармацыі.

Разглядаючы шлях мастацкай адукацыі як бесперапынны працэс станаўлення інтэлектуальнага патэнцыялу чалавека ў мастацкім асяроддзі, можна сцвярджаць, што мастацкая адукацыя ўбірае ў сябе паслядоўную распрацоўку тэндэнцый, формаў, метадаў, прынцыпаў, стылю суадносін майстра і вучня ў адлюстраванні светапогляду пэўных эпох.

Працэс фарміравання спецыяльнай мастацкай адукацыі развіваўся і ўдасканальваўся да сярэдзіны XX ст. Кульмінацыйным пунктам у развіцці мастацкай адукацыі стала віртуозная сканцэнтраванасць на сваім відзе мастацтва, нават не столькі на асобным відзе, колькі на канкрэтнай спецыяльнасці ў межах гэтага віду. На прыкладзе музычнага

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

мастацтва гэты тэзіс можна пацвердзіць тым, што нават у межах спецыяльнасці фартэпіяннага выканання ў другой палове XX ст. стала практыкавацца строгая дыферэнцыяцыя піяністаў – салістаў, удзельнікаў ансамбля, канцэртмайстраў. Гэта назіраецца не толькі ў практыцы, але і ў адукацыйнай сістэме, калі вучэбны працэс і профіль дыплома суадносна сцвярджаюць такі прынцып і накіроўваюць дзейнасць музыканта і яго светапогляд на вузкапрафесійную арыентацыю. У такім выпадку агульная культура, якая выходзіць за рамкі спецыялізацыі, губляе сваю інтэнсіўнасць. Удзел творцы ў непрафесійнай культуры часта адыходзіць на другі план.

Тэндэнцыя выхавання вузкапрафесійнага спецыяліста ў 70—80-я гады XX ст. дасягнула свайго апагея. Удасканальванне майстэрства па шляху звужэння задач і абмежавання прафесійнага прызначэння можа прывесці да абсурду. Разуменне такога становішча (можа, і не зусім асэнсаванае) абумовіла імкненне творцаў у другой палове XX ст. сінтэтычна ўвайсці, пранікнуць у сумежныя галіны мастацтва. Гэты працэс атрымаў адлюстраванне і ў мастацкай адукацыі, якая завяршыла гістарычны віток свайго станаўлення, стварыла пэўную адукацыйную цывілізацыю.

XX стагоддзе стала стагоддзем тэхнічнага прагрэсу. На яго аснове сфарміраваліся новыя мастацтвы – мастацтвы тэхнагенныя: кіно, радыё, тэлебачанне, гуказапіс, камп'ютэрныя рэаліі, якія вызначылі новыя сродкі рэпрадуцыравання і распаўсюджвання мастацкіх твораў. На мяжы традыцыйных і сучасных (тэхнагенных) мастацтваў сфарміраваліся новыя стылістычныя плыні і кірункі (авангардызм, канкрэтная і электронная музыка), жанры (радыё-, тэлеспектакль, радыёопера, тэлебалет) і формы пранікнення ў мастацкую культуру (віртуальнае наведванне музеяў, канцэртных залаў).

У апошнія два дзесяцігоддзі XX ст. назіралася тэндэнцыя да фарміравання новых адносін у арганізацыі мастацкай адукацыі, у інтэрпрэтацыі сэнсу прафесійна адукаванага творцы, яго спецыялізацыі. Узніклі новыя спецыяльнасці – кінарэжысёр, кінааператар, акцёр кіно і тэлебачання, гукарэжысёр, дызайнер, камп'ютэрная аранжыроўка музычнага твора, камп'ютэрная графіка, менеджэр мастацкай культуры. Іх узнікненне абумоўлівалася не толькі прагрэсам агульнай культуры XX ст., але і пошукам новых магчымасцей дзейнасці мастака ў грамадстве. Сучасныя тэхнагенныя мастацтвы і тэхнагенныя метады далейшага развіцця традыцыйных мастацтваў складаюць значную частку агульнай сістэмы функцыянавання ўсіх відаў мастацтва.

Новыя спецыяльнасці складваюцца не толькі ў межах традыцыйных навучальных устаноў – музычных і мастацкіх школ, вучылішчаў, Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі, Беларускай акадэміі мастацтваў, але і стымулююць стварэнне мастацка-адукацыйных устаноў новага тыпу – школ і вучылішчаў мастацтваў, Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры.

Мастацтва і мастацкая адукацыя становяцца тым інструментам, які дазваляе ўдасканальваць працэс і сінтэзаваць сродкі фарміравання чалавека, спецыяліста, творцы. Мастацкая педагогіка ў шырокім сэнсе звяртаецца да новых метадычных прынцыпаў – свабоднага разумення, чуласці да змен у навакольным і ўнутраным свеце, выхавання асобы, якая самастойна, шырока, рэальна і перспектыўна мысліць.

Мастацкая адукацыя разглядаецца ў двух цесна звязаных аспектах: агульнакультурным і вузкапрафесійным, асабістым далучэнні да мастацтва. Нездарма ў апошняе дзесяцігоддзе XX ст. і пачатку XXI ст. назіраецца працэс далучэння “вузкіх” спецыялістаў да больш шырокіх і агульнанавуковых праблем. Набірае трываласць тэндэнцыя выхаду музыкантаў-выканаўцаў, акцёраў, рэжысёраў, мастакоў-жанрыстаў на новы шлях тэарэтычнага асэнсавання творчых працэсаў, што выяўляецца ў шматлікіх публікацыях і абароне дысертацый па мастацтвазнаўстве.

Падставай для выхаду на больш шырокае і грунтоўнае тэарэтычнае асэнсаванне вузкаспецыяльнай мастацкай практыкі стала трансфармацыя сутнасці і пераліку выкладаемых гісторыка-тэарэтычных мастацтвазнаўчых дысцыплін. Калі раней у кансерваторыі вывучалі толькі гісторыю музычнага мастацтва, а ў тэатральна-мастацкім інстытуце (з улікам адпаведных спецыяльнасцей) – толькі гісторыю тэатральнага і выяўленчага мастацтваў, дык зараз у гэтых навучальных установах незалежна ад іх профілю вывучаецца гісторыя ўсіх відаў мастацтва. Адзначаная з'ява зноў-такі вызначае

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

тэндэнцыю да пашырэння межаў спецыяльнасці, імкненне да сінтэзавання мастацкіх ведаў.

Сінтэз вывучаемых дысцыплін не павінен будавацца на прынцыпе растварэння аднаго мастацтва ў другім. Неабходнай перадумовай паспяховасці сінтэтычнага супрацоўніцтва з'яўляецца захаванне і больш выразная акрэсленасць спецыфікі і музычнага, і тэатральнага, і выяўленчага мастацтваў.

Менавіта вывучэнне гарманічнай цэласнасці гісторыі і тэорыі мастацтваў абумовіла ўключэнне ў праграму сярэдніх навучальных устаноў такой дысцыпліны, як сусветная мастацкая культура. Для забеспячэння гэтага прадмета педагагічнымі кадрамі адпаведна ўведзена і новая мастацтвазнаўчая спецыялізацыя “выкладчык су-светнай і айчыннай мастацкай культуры” ў Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры, Беларускім дзяржаўным педагагічным універсітэце імя М.Танка.

Уяўляецца даволі заканамерным, што нарэшце мы прыйшлі да разумення неабходнасці ў працэсе вучэбнай практыкі знаёміцца з мастацкай культурай эпохі цэласна, не падзяляючы яе на асобныя віды. Для такой падачы матэрыялу патрэбны спецыяльныя педагагічныя кадры, якія б маглі выкладаць не ізаляваныя па розных відах мастацтвы, а цэласна акрэсліць мастацкую культуру народа, краіны, эпохі, ствараць сінтэтычны мастацкі вобраз.

Аб арганічным сінтэзе вывучаемых дысцыплін і стварэнні на гэтай аснове новай спецыяльнасці нельга было гаварыць, пакуль быў разрыў паміж узроўнямі living розпрофільнай адукацыі. У другой палове XX ст. мастацкая адукацыя ў Беларусі ў розных відах мастацтва выраўнялася па формах, змесце, узроўнях дасягнення. Таму пытанне сінтэтычнага спалучэння відаў мастацтва ў вывучэнні гісторыі мастацкай культуры ў значнай ступені правамернае. Рэаліі стварэння новых спецыяльнасцей вылучаны самой сутнасцю рэчаіснасці.

Мастацкая адукацыя, якая функцыянальна з самага пачатку свайго фарміравання адлюстроўвала актуальныя запатрабаванні жыцця, заўсёды балансуе паміж выхаваннем асобы прафесіянала і ўвядзеннем яе ў сацыяльныя сістэмы. Мастацкая адукацыя таксама заўсёды балансуе паміж арыентацыяй на мінулыя дасягненні (традыцыі) і імкненнем да будучыні, новай і непрадказальнай.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ